УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
ПАЛЕСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

І.Э. ЯЛЕНСКАЯ, В.Л. ЛАЗІЦКІ

# Гісторыя беларускай дзяржаўнасці: кантрольна-дыягнастычныя матэрыялы

*Для студэнтаў усіх спецыяльнасцей і форм адукацыі*

Тлумачальная запіска
Кантрольна-дыягнастычныя матэрыялы
Спіс рэкамендаванай літаратуры

Пінск
ПалесДУ
2022

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» ажыццяўляецца ў складзе цыкла сацыяльна-гуманітарных дысцыплін студэнтамі першых курсаў усіх спецыяльнасцяў вышэйшай адукацыі (акрамя профільных спецыяльнасцяў) і арыентавана на фарміраванне ўстойлівых уяўленняў аб гістарычным мінулым і кірунках далейшага развіцця беларускай дзяржавы. У сваей міждысцыплінарнасці змест курса абапіраецца на канцэптуальныя веды аб гісторыі развіцця дзяржаўных інстытутаў, неад'емных атрыбутах беларускай дзяржаўнасці. У ім знайшоў адлюстраванне сістэмны падыход да навуковага разумення гісторыі фарміравання і развіцця розных этапаў беларускай дзяржавы, яе эвалюцыю з улікам унутраных фактараў і глабальных працэсаў сучаснасці.

У сваей мэтавай накіраванасці засваенне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» прадугледжвае фарміраванне ў будучых спецыялістаў-выпускнікоў устаноў вышэйшай адукацыі шэрагу універсальных кампетэнцый:

– валодаць здольнасцю аналізаваць працэсы дзяржаўнага будаўніцтва ў розныя гістарычныя перыяды, выяўляць фактары і механізмы гістарычных змяненняў, вызначаць сацыяльна-палітычнае значэнне гістарычных падзей (асоб, артэфактаў і сімвалаў) для сучаснай беларускай дзяржаўнасці, у дасканаласці выкарыстоўваць выяўленыя заканамернасці ў працэсе фарміравання грамадзянскай ідэнтычнасці;

– валодаць якасцямі патрыятызму і грамадзянскасці;

– быць здольным фарміраваць свой ўласны пункт гледжання на які вывучаецца працэс (з'ява);

– валодаць сістэмным і параўнальным аналізам;

– валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.

Паспяховае засваенне вучэбнай дысцыпліны прадугледжвае сістэмна арганізуемую вучэбна-пазнавальную дзейнасць, у тым ліку і самастойна ажыццяўляемую. Пры гэтым надзвычай важнай умовай у працэсе арганізацыі і ажыццяўлення працэсу навучання ўяўляецца не толькі нацэленасць на прагназуемы паспяховы вынік, але і забеспячэнне карысным і эфектыўным інструментарыем педагагічнай дыягностыкі і кантролю. Нараўне з навучальным дапаможнікам, хрэстаматыяй і картаграфічным матэрыялам атласа ў арганізацыі этапнага і выніковага кантролю дзейсную дапамогу студэнтам і выкладчыкам акажуць

прапанаваныя комплексы тэставых заданняў кантрольна-дыягнастычнага характару. У сваей структуры яны аб'ядноўваюць тэматычныя тэсты да вывучаных раздзелаў навучальнага дапаможніка, а таксама тэставыя матэрыялы абагульняючага характару, адаптаваныя ў сваім змесце да палажэнняў вучэбнай праграмы па дысцыпліне «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці». Пры складанні рознаўзроўневых заданняў аўтарамі ўлічаны навуковыя патрабаванні тэсталогіі, а таксама і шматкампанентны склад навучальных ведаў.

Важным аспектам у арганізацыі навучання студэнтаў (у тым ліку і пры ажыццяўленні самастойнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці) уяўляецца не толькі сам педагагічны кантроль, але і дэталевая дыягностыка навучальных дасягненняў пры магчымай карэкцыі атрыманых вынікаў (калі ў гэтым есць неабходнасць). Кантроль ажыццяўляецца па засваенню тэарэтычных, факталагічных (у тым ліку храналагічных і картаграфічных) кампанентаў навучальных ведаў, суадносных з ўзроўнямі засваення зместу вучэбнага матэрыяла. Яго значны аб'ем, а таксама сама спецыфіка гістарычных ведаў абумоўліваюць неабходнасць прымянення ў працэсе падрыхтоўкі сістэмнага і змястоўнага падыходу. Відавочна, што без гэтага немагчыма дасягненне добрага выніку. Разам з выкарыстаннем іншых дыдактычных сродкаў навучання зварот да тэставых методык якасна павышае ступень засваення кампанентаў навучальных ведаў і ўзровень падрыхтаванасці, паколькі ў сваім інструментальным патэнцыяле тэст можа выконваць не толькі функцыю кантролю і карэкцыі, але і выступаць у якасці сродка навучання. Выкананне тэставых заданняў і іх апрацоўка даюць магчымасць на кожным этапе арганізуемага навучання і кантролю атрымліваць дадзеныя аб узроўнях засваення студэнтам вучэбнай інфармацыі па тым ці іншым тэматычным кірунку і своечасова ажыццяўляць неабходную карэкцыю. Магчымасць самакантролю і самакарэкцыі, у сваю чаргу, якасна змяняе матывацыю працэсу падрыхтоўкі.

Кожны варыянт тэставых комплексаў ўключае ў сябе 51 заданне. Заданні 1-30 (тэставыя заданні закрытага тыпу) патрабуюць выбару аднаго або некалькіх варыянтаў адказаў з мноства прапанаваных. Кантролю падлягаюць тэарэтычныя, факталагічныя (у тым ліку і храналагічныя) кампаненты навучальных гістарычных ведаў. Пры паспяховым і поўным выкананні дадзенай часткі комплексу заданняў (у тым ліку і адзінкавых заданняў з выбарам некалькіх верных адказаў) студэнт здольны максімальна атрымаць 30 балаў.

Выкананне заданняў B1-B7 (тэставыя заданні адкрытага тыпу) прадугледжвае дакладнае вызначэнне паслядоўнасці прапанаваных элементаў (напрыклад, БВГА). У дадзеным выпадку інструментар тэставых заданняў дазваляе выявіць разуменне навучэнцам логікі гістарычнага працэсу дзяржаваўтварэння, паслядоўнасці падзей, выяўленне прычынна-следчых сувязяў. Поўнае і дакладнае выкананне заданняў гэтай частцы тэставага комплексу дазволіць студэнту атрымаць 21 бал (3x7).

Заданні B8-B14 з'яўляюцца тэставымі заданнямі адкрытага тыпу, а іх выкананне прадугледжвае вызначэнне прычынна-следчых сувязяў і залежнасцяў пры дакладным суаднясенні элементаў двух няроўных мностваў, якія пазначаныя лічбамі і літарамі (напрыклад, 1А2В3Д4Б). Кожнаму элементу аднаго мноства адпавядае адзін элемент іншага прапанаванага мноства (пры гэтым у мностве з пяці элементаў адзін з'яўляецца лішнім, што павялічвае ўзровень складанасці выкананага задання). Максімум балаў, які студэнт здольны атрымаць пры поўным і верным выкананні дадзенай часткі, складзенай з 7 заданняў – 28. Кожнае асобна ўзятае заданне на вызначэнне адпаведнікаў у сваім выніку вылічваецца з колькасці дакладна вызначаных (1+1+1+1+1). Аднак варыянт няпоўнага адказу (а такі не выключаецца) можа быць і іншым (напрыклад, 1+0+1+0).

Як пацвярджае практыка падрыхтоўкі, менавіта пры выкананні заданняў на вызначэнне прычынна-следчых сувязяў і паслядоўнасці прапанаваных элементаў, а таксама напісанне свабодна фармулюемых адказаў студэнты дапускаюць найбольшую колькасць памылак і недакладнасцяў, што можа сведчыць пра недахопы пры засваенні, сістэматызацыі і абагульненні гістарычных ведаў, уменняў і навыкаў.

Заданні B15-B21 уяўляюць сабой таксама тэставыя заданні адкрытага тыпу (у тым ліку і заданні на веданне гістарычнай картаграфіі). Зыходзячы з фармулеўкі выкананага задання афармленне адказаў на іх прадугледжвае напісанне лічбавага абазначэння (напрыклад, пазначанага на гістарычнай карце), даты, а таксама тэрміна, назвы, або словазлучэння. У дадзенай частцы тэставых комплексаў у адпаведнасці з агульнай спецыфікацыяй тэставых заданняў змешчаны заданні для кантролю як факталагічнага (у тым ліку і храналагічнага, гісторыка-геаграфічнага), так і тэарэтычнага кампанентаў навучальных ведаў на ўзроўні разумення іх студэнтамі. Дакладнае выкананне заданняў гэтай часткі тэставага комплексу дазволіць навучэнцу максімальна атрымаць 21 балаў (3x7).

Такім чынам, пры поўным і верным выкананні ўсяго комплексу

тэставых заданняў у варыянце ў сваім максімуме можа скласці 100 балаў. Лічбавае адлюстраванне атрыманага выніку дазволіць адсочваць дынаміку засваення кампанентаў вучэбнага матэрыялу і ажыццяўляць, калі ў гэтым есць неабходнасць, карэкцыю – вяртанне да вывучэння тых ці іншых параграфаў раздзелаў навучальнага дапаможніка да іх поўнага і трывалага засваення. У гэтай сувязі ў рамках паслядоўнай паэтапнай падрыхтоўкі належная ўвага павінна надавацца і тэматычнаму абагульненню, якому прысвечаны варыянты адпаведных комплексаў тэставых заданняў.

Варта адзначыць, што эфектыўная падрыхтоўка студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» прадугледжвае менавіта сістэмную вучэбную працу з усімі згаданымі намі сродкамі навучання (вучэбны дапаможнік, хрэстаматыя, гістарычны атлас, тэставыя комплексы). Менавіта ў сістэмнасці крыецца заклад поспеху. Мэтазгодна выкарыстанне дыдактычнага забеспячэння навучальнага дапаможніка – пытанняў, змешчаных пасля параграфаў і раздзелаў тэм.

Аўтары спадзяюцца, што прапануемы дыдактычны матэрыял стане карысным для студэнтаў і выкладчыкаў для арганізацыі і ажыццяўлення ўсіх даступных відаў і форм вучэбна-пазнавальнай дзейнасці.

# КАНТРОЛЬНА-ДЫЯГНАСТЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

## РАЗДЗЕЛ 1
## АСНОЎНЫЯ ЭТАПЫ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ
## ВАРЫЯНТ 1

| № | Фармулеўкі заданняў | Варыянт (варыянты) адказу (адказаў) |
|---|---|---|
| А 1 | Такая палітычная форма арганізацыі грамадства, з дапамогай якой рэгулююцца сумесная дзейнасць і ўзаемаадносіны людзей, існуе адзіная сістэма абароны іх правоў і суверэнітэту, – гэта: | 1) горад;<br>2) грамадства;<br>3) дзяржава;<br>4) улада. |
| А 2 | Магчымасць і здольнасць навязаць сваю волю, ўздзейнічаць на дзейнасць і паводзіны іншых людзей, нават насуперак іх супраціву, – гэта: | 1) войска;<br>2) манархія;<br>3) улада;<br>4) урад. |
| А 3 | Дата прыгадвання ў «Аповесці мінулых гадоў» легендарнага запрашэння варагаў на Русь прыпадае на: | 1) 860 г.;<br>2) 862 г.;<br>3) 882 г.;<br>4) 980 г.. |
| А 4 | Полацкі князь, у перыяд княжэння якога княства дасягнула найбольшага росквіту, – гэта: | 1) Глеб Усяславіч;<br>2) Ізяслаў Уладзіміравіч;<br>3) Рагвалод;<br>4) Усяслаў Брачыславіч. |
| А 5 | Старажытны беларускі горад, першае прыгадванне якога звязваецца са згадваннем ў гістарычных крыніцах бітвы на Нямізе, – гэта: | 1) Берасце;<br>2) Менск;<br>3) Полацк;<br>4) Тураў. |
| А 6 | Аб развіцці дзяржаваўтваральных працэсаў на беларускіх землях у IX–XIII стст. сведчаць (*неабходна вылучыць некалькі верных варыянтаў*): | 1) абменна-гандлевыя сувязі насельніцтва ва ўмовах натуральнай гаспадаркі;<br>2) археалагічныя знаходкі керамікі і вырабаў з бронзы;<br>3) існаванне ўлады князя, распаўсюджанай на падуладнае насельніцтва;<br>4) правядзенне незалежнай |

| | | |
|---|---|---|
| | | палітыкі полацкіх князеў;<br>5) прыгадванне славян у гістарычных крыніцах<br>6) рассяленне насельніцтва па кроўнароднаснай прыкмеце;<br>7) рассяленне насельніцтва па тэрытарыяльнай прыкмеце. |
| А 7 | Першы гістарычна дакладна вядомы Вялікі князь Літоўскі – гэта: | 1) Альгерд;<br>2) Вітаўт;<br>3) Міндоўг;<br>4) Ягайла. |
| А 8 | Адна з асаблівасцей утварэння Вялікага Княства Літоўскага – гэта: | 1) абумоўленасць значным абвастрэннем рэлігійнага пытання на беларускіх землях;<br>2) зацікаўленасць польскай шляхты ў «залатых шляхецкіх вольнасцях»;<br>3) значны уплыў знешнепалітычнага фактара – ваеннай пагрозы;<br>4) уплыў палітычнага і эканамічнага крызісу ў Рэчы Паспалітай. |
| А 9 | Дата ўтварэння Рэчы Паспалітай – гэта: | 1) 1385 г.;<br>2) 1468 г.;<br>3) 1569 г.;<br>4) 1596 г.. |
| А 10 | Галоўнымі прычынамі падзелаў Рэчы Паспалітай з’яўляюцца (*неабходна вылучыць некалькі верных варыянтаў*): | 1) ваенныя паразы ў Лівонскай вайне;<br>2) востры дынастычны крызіс;<br>3) зацікаўленасць уплывовых еўрапейскіх краін у паслабленні Рэчы Паспалітай;<br>4) імкненне шляхты да «залатых шляхецкіх вольнасцей»;<br>5) складванне унутранага палітычнага і эканамічнага крызісу ў дзяржаве. |
| А 11 | Апошні кароль Рэчы Паспалітай, у час праўлення якога беларускія землі былі далучаны да Расійскай імперыі, – гэта: | 1) Жыгімонт Аўгуст I;<br>2) Жыгімонт II Аўгуст;<br>3) Станіслаў Аўгуст Панятоўскі;<br>4) Станіслаў Ляшчынскі. |
| А 12 | Дата заключэння міждзяржаўнага пагаднення, | 1) 1772 г.;<br>2) 1793 г.; |

| | | |
|---|---|---|
| | згодня з якім да Расійскай імперыі была далучана Беласточчына, – гэта: | 3) 1795 г.;<br>4) 1807 г.. |
| А 13 | У сярэдзіне XIX ст. – пачатку XX ст. канцэпцыя, згодна якой гістарычнасць беларусаў атаясамлівала іх з вялікарускім этнасам, адмаўлялась іх самастойнасць і самабытнасць як этнічнай адзінкі, – гэта: | 1) вялікапаланізм;<br>2) заходнерусізм;<br>3) сарматызм;<br>4) шавінізм. |
| А 14 | Адна з галоўных мэт паўстанняў 1830–1831 і 1863–1864 гг. – гэта: | 1) адмена прыгоннага права;<br>2) аднаўленне Рэчы Паспалітай;<br>3) прынясце канстытуцыі;<br>4) скасаванне сялянскай абшчыны і ўвядзенне земстваў. |
| А 15 | Гістарычная падзея, якая моцна паўплывала на працэс нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва на тэрыторыі Беларусі ў 1917–1918 гг., – гэта: | 1) абвяшчэнне ССРБ;<br>2) Першая руская рэвалюцыя;<br>3) Першая сусветная вайна;<br>4) узбуўненні тэрыторыі БССР у міжваенны перыяд. |
| А 16 | Дата ўтварэння ЛітБелССР прыпадае на: | 1) 9 сакавіка 1918 г.;<br>2) 1 студзеня 1919 г.;<br>3) 27 лютага 1919 г.;<br>4) 31 ліпеня 1920 г.. |
| А 17 | Міждзяржаўнае дыпламатычнае пагадненне, згодна з якім тэрыторыя Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд знаходзілася ў складзе Польшчы, – гэта: | 1) Брэсцкі мір;<br>2) Версальскі мір;<br>3) Рыжскі мір;<br>4) Тыльзіцкі мір. |
| А 18 | Гістарычныя падзеі, якія паўплывалі на працэс уз'яднання Заходняй Беларусі з БССР (*неабходна вылучыць некалькі верных варыянтаў*): | 1) абвяшчэнне БНР;<br>2) дэнансацыя дзеяння ўмоў Рыжскага міру з боку СССР;<br>3) напад Германіі на СССР;<br>4) пачатак Другой сусветнай вайны;<br>5) увядзенне войск Чырвонай Арміі на тэррыторыю Захозняй Беларусі і Заходняй Украіны;<br>6) узбуйненні тэрыторыі БССР у міжваенны перыяд; |

| | | |
|---|---|---|
| | | 7) утварэне ЛітБелССР. |
| А 19 | У час рэалізацыі стратэгічнага плана нападу Германіі на СССР наступленне на тэрыторыі Беларусі ажыццяўляла група армій, якая мела кодавую назву: | 1) «Поўдзень»;<br>2) «Поўнач»;<br>3) «Усход»;<br>4) «Цэнтр». |
| А 20 | Ва ўмовах акупацыі ўсвядомленае, добраахвотнае і наўмыснае супрацоўніцтва з ворагам, у яго інтарэсах і ў шкоду сваей дзяржаве – гэта: | 1) інкарпарацыя;<br>2) калабарацыянізм;<br>3) люстрацыя;<br>4) нацыяналізм. |
| А 21 | План каланізацыі і германізацыі акупіраваных тэрыторый Усходняй Еўропы меў кодавую назву: | 1) «Барбароса»;<br>2) «Блау»;<br>3) «Вайс»;<br>4) «Ост». |
| А 22 | Першыя ў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны партызаны Беларусі, якія былі ўзнагароджаны ганаровым званнем «Герой Савецкага Саюза» (*неабходна вылучыць некалькі верных варыянтаў*): | 1) Ц. Бумажкоў;<br>2) І. Казінец;<br>3) В. Корж;<br>4) Ф. Паўлоўскі;<br>5) А. Федараў. |
| А 23 | Прыкметай змянення міжнароднага статуса БССР у пасляваенны перыяд з'яўляецца: | 1) новы адміністратыўна-тэрытарыяльны падзел рэспублікі;<br>2) удзел у стварэнні і дзейнасці ААН;<br>3) утварэнне наркамата замежных спраў замест міністэрства.<br>4) фарміраванне новага складу беларускай партыйна-гаспадарчай эліты. |
| А 24 | Час пачатку працэса аднаўлення народнай гаспадаркі БССР прыпадае на: | 1) восень 1943 г.;<br>2) восень 1944 г.;<br>3) вясну-лета 1945 г.;<br>4) вясну-лета 1946 г.. |
| А 25 | Аднаўленне ў правах, аднаўленне страчанага добрага імя, адмена неабгрунтаванага абвінавачвання невінаватай асобы альбо групы асоб, – гэта: | 1) калабарацыя;<br>2) рэабілітацыя;<br>3) рэпатрыяцыя;<br>4) рэстытуцыя. |

| | | |
|---|---|---|
| А 26 | Аўтары зацверджанага ў 1955 г. Дзяржаўнага гімна БССР – гэта (*неабходна вылучыць некалькі верных варыянтаў*): | 1) У. Карызна;<br>2) М. Клімковіч;<br>3) С. Міхалкоў;<br>4) П. Панчанка;<br>5) Н. Сакалоўскі;<br>6) Г. Эль-Рэгістан. |
| А 27 | Сістэма прававых, палітычных, маральных, філасофскіх, рэлігійных, мастацкіх поглядаў і ідэй, якія адлюстроўваюць пазіцыю палітычнай партыі, групы людзей або асобы, – гэта: | 1) галоснасць;<br>2) грамадства;<br>3) ідэалогія;<br>4) светапогляд. |
| А 28 | Дата, на якую прыпадае пачатак дзеяння Дагавора аб стварэнні Еўразійскага эканамічнага саюза з удзелам Беларусі, Расіі, Казахстана, Арменіі, Кыргызстана, – гэта: | 1) 2003 г.;<br>2) 2008 г.;<br>3) 2010 г.;<br>4) 2015 г.. |
| А 29 | Усенароднае галасаванне па найважнейшых пытаннях развіцця краіны, – гэта: | 1) галоснасць;<br>2) дэмакратыя;<br>3) рэспубліка;<br>4) рэферэндум. |
| А 30 | Падзеі гісторыі беларускай дзяржаўнасці, якія адбыліся ў 1994 г., – гэта: | 1) абранне першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;<br>2) падпісанне Дагавора аб стварэнні Супольнасці Беларусі і Расіі;<br>3) прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР;<br>4) прыняцце першай рэдакцыі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь;<br>5) стварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў. |
| В 1 | Вызначце дакладна ў гістарычнай паслядоўнасці (*напрыклад, АБГВ*):<br>А) будаўніцтва ў Полацку сабора Святой Сафіі;<br>Б) высылка полацкіх князей у Візантыю; | |

| | | |
|---|---|---|
| | В) прыняцце на Русі ў якасці афіцыйнай рэлігіі хрысціянства;<br>Г) утварэнне на тэрыторыі Беларусі славянскіх саюзаў плямен. | |
| В 2 | Вызначце дакладна ў гістарычнай паслядоўнасці (*напрыклад, АБГВ*):<br>А) Альгерд;<br>Б) Вітаўт;<br>В) Гедзімін;<br>Г) Ягайла. | |
| В 3 | Вызначце дакладна ў гістарычнай паслядоўнасці (*напрыклад, АБГВ*):<br>А) дзейнасць беларускіх народнікаў;<br>Б) заканчэнне інкарпарацыі беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі;<br>В) скасаванне рашэннямі Полацкага царкоўнага сабора ўніяцтва;<br>Г) стварэнне першай беларускай палітычнай партыі – Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ) | |
| В 4 | Вызначце дакладна ў гістарычнай паслядоўнасці (*напрыклад, АБГВ*):<br>А) абвяшчэнне БНР;<br>Б) абвяшчэнне ССРБ;<br>В) утварэнне ЛітБелССР;<br>Г) утварэнне СССР. | |
| В 5 | Вызначце дакладна ў гістарычнай паслядоўнасці (*напрыклад, АБГВ*):<br>А) ажыццяўленне вермахтам ваеннага стратэгічнага плана «Вайс»;<br>Б) пачатак поўнай акупацыі тэрыторыі Беларусі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны; | |

| | | |
|---|---|---|
| | В) пачатак рэалізацыі ваеннага стратэгічнага плана вермахта «Барбароса».<br>Г) разгортванне шырокага і масавага партызанскага і падпольнага руху на акупіраванай тэрыторыі Беларусі. | |
| В 6 | Вызначце дакладна ў гістарычнай паслядоўнасці (*напрыклад, АБГВ*):<br>А) пачатак першых мерапрыемстваў па аднаўленню народнай гаспадаркі БССР;<br>Б) поўнае вызваленне тэрыторыі Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў;<br>В) прыняцце Канстытуцыі БССР («Канстытуцыя развітога сацыялізма»);<br>Г) удзел БССР ва ўтварэнні ААН. | |
| В 7 | Вызначце дакладна ў гістарычнай паслядоўнасці (*напрыклад, АБГВ*):<br>А) абвяшчэнне палітыкі перабудовы;<br>Б) абранне першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;<br>В) прыняцце першай рэдакцыі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь;<br>Г) стварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў. | |
| В 8 | Правільна суаднясіце элементы двух мностваў (*напрыклад, 1В2Г3Б4Д*):<br>1) Брачыслаў Ізяславіч;<br>2) Ізяслаў Уладзіміравіч;<br>3) Усяслаў Брачыславіч;<br>4) Юрый Яраславіч. | |

| | | |
|---|---|---|
| | А) барацьба Полацка з Яраславам Мудрым за кантроль над волакамі;<br>Б) барацьба Полацкага княства з крыжакамі;<br>В) барацьба Турава за незалежнасць ад Кіева;<br>Г) будаўніцтва сабора Святой Сафіі ў Полацку;<br>Д) заснаванне Полацкага епіскапства. | |
| В 9 | Правільна суаднясіце элементы двух мностваў (*напрыклад, 1В2Г3Б4Д*):<br>1) 1385 г.;<br>2) 1468 г.;<br>3) 1569 г.;<br>4) 1588 г..<br><br>А) прыняцце Крэўскай уніі;<br>Б) прыняцце Люблінскай уніі;<br>В) прыняцце Судзебніка Казіміра Ягелончыка;<br>Г) прыняцце III Статута ВКЛ;<br>Д) стварэнне Трыбунала ВКЛ. | |
| В 10 | Правільна суаднясіце элементы двух мностваў (*напрыклад, 1В2Г3Б4Д*):<br>1) Беласток;<br>2) Вільня;<br>3) Мінск;<br>4) Полацк.<br><br>А) «Курлоўскі расстрэл»;<br>Б) дзейнасць групы беларускіх народнікаў «Гоман»;<br>В) пачатак выдання першай легальнай беларускай газеты «Наша Доля»;<br>Г) скасаванне ўніяцтва;<br>Д) уваходжанне ў склад | |

| | | |
|---|---|---|
| | Расійскай імперыі згодна ўмоў Тыльзіцкага міра. | |
| В 11 | Правільна суаднясіце элементы двух мностваў (*напрыклад, 1В2Г3Б4Д*):<br>1) абвяшчэнне БНР;<br>2) абвяшчэнне ЛітБелССР;<br>3) абвяшчэнне ССРБ;<br>4) утварэнне БСРГ.<br><br>А) З. Жылуновіч, А. Чарвякоў;<br>Б) В. Міцкявічус-Капсукас, К. Цыхоўскі;<br>В) А. Смоліч, А. Лучкевіч;<br>Г) Б. Тарашкевіч, П. Мятла;<br>Д) В. Харужая, С. Прытыцкі. | |
| В 12 | Правільна суаднясіце элементы двух мностваў (*напрыклад, 1В2Г3Б4Д*):<br>1) абарона Брэсцкай крэпасці ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны;<br>2) абарона Магілева ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны;<br>3) вызваленне Мінска ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны;<br>4) дзейнасць калабаранцкіх арганізацый ў перыяд акупацыі ў час Вялікай Айчыннай вайны.<br><br>А) Ф. Акінчыц, І. Ермачэнка, Ф. Кушаль;<br>Б) А. Бурдзейны, М. Паноў, Д. Фролікаў;<br>В) П. Гаўрылаў, І. Зубачоў, Я. Фамін;<br>Г) А. Ермакоў, І. Русіянаў, В. Юшкевіч;<br>Д) С. Куцепаў, І. Мазалаў, М. Раманаў. | |
| В 13 | Правільна суаднясіце элементы двух мностваў | |

| | | |
|---|---|---|
| | (*напрыклад, 1В2Г3Б4Д*):<br>1) кіраўніцтва АН БССР;<br>2) кіраўніцтва ЦК КПБ;<br>3) стварэнне ўзорнага эскіза Дзяржаўнага сцяга БССР;<br>4) утварэнне ААН.<br><br>А) М. Гусеў;<br>Б) К. Кісялеў;<br>В) У. Крукоўскі;<br>Г) В. Купрэвіч;<br>Д) К. Мазураў. | |
| В 14 | Правільна суаднясіце элементы двух мностваў (*напрыклад, 1В2Г3Б4Д*):<br>1) абвяшчэнне палітыкі перабудовы;<br>2) выкарыстанне вышэйшых форм волевыяўлення народа;<br>3) пераход да прэзідэнцкай рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь;<br>4) распад СССР.<br><br>А) галоснасць;<br>Б) Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь;<br>В) рэферэндум;<br>Г) «адліга»;<br>Д) «парад суверэнітэтаў». | |
| В 15 | ….  тэорыя адлюстроўвае навуковы падыход, згодна якому ў працэсе ўзнікнення дзяржаўнасці ва ўсходніх славян вырашальная ўплывовая роля належала варагам (нарманам). | |
| В 16 | Старажытны беларускі горад, які з’яўляўся цэнтрам збірання зямель у адзіную дзяржаву ў сярэдзіне XIII ст. (*вызначце лічбу на карце і назву, напрыклад: 2МІНСК*): | |

| | | |
|---|---|---|
| |  | |
| В 17 | …. – гэта паняцце (тэрмін) якое пазначае гістарычны працэс уключэння ў склад іншай дзяржавы, далучэнне. | |
| В 18 | …. – гэта абрэвіятура, якая пазначае скарочаную назву беларускай дзяржавы, абвешчаную згодна Маніфеста 1 студзеня 1919 г. | |
| В 19 | …. – это паняцце, якім пазначаюць планамернае фізічнае знішчэнне насельніцтва шляхам забойства і іншых дзеянняў, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі ў перыяд акупацыі ў часы Вялікай Айчыннай вайны. | |
| В 20 | Беларускі горад, які быў абвешчаны сталіцай СНД у 19991 г. (*вызначце лічбу на карце і назву, напрыклад: 2БРЭСТ*):  | |
| В 21 | Згодна Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, пачынаючы з 1998 г. штогод кожную другую нядзелю мая | |

| | | |
|---|---|---|
| | адзначаецца дзяржаўнае свята – …. …. …. ….. …. . | |

**ВАРЫЯНТ 2**

| № | Фармулеўкі заданняў | Варыянт (варыянты) адказу (адказаў) |
|---|---|---|
| А 1 | Тэрытарыяльны саюз (аб'яднанне, супольнасць) грамадзян, утвораны з мэтай абароны іх правоў на жыцце, свабоду, маемасць, – гэта: | 1) горад;<br>2) грамадства;<br>3) дзяржава;<br>4) улада. |
| А 2 | Прававая прыналежнасць асобы да дзяржавы вызначаецца паняццем: | 1) грамадзянства;<br>2) суверэнітэт;<br>3) улада;<br>4) урад. |
| А 3 | Дата гістарычна першага прыгадвання ў гістарычных крыніцах Полацка прыпадае на: | 1) 860 г.;<br>2) 862 г.;<br>3) 882 г.;<br>4) 980 г.. |
| А 4 | Полацкі князь, у перыяд княжэння якога сімвалам магутнасці княства стала будаўніцтва сабора Святой Сафіі, – гэта: | 1) Глеб Усяславіч;<br>2) Ізяслаў Уладзіміравіч;<br>3) Рагвалод;<br>4) Усяслаў Брачыславіч. |
| А 5 | Старажытны беларускі горад, які з'яўляўся прыкладам сумеснага кіравання князем і пасаднікам, – гэта: | 1) Берасце;<br>2) Менск;<br>3) Полацк;<br>4) Тураў. |
| А 6 | Прыклады назваў найбольш буйных усходнеславянскіх племянных аб'яднанняў, якія былі расселены на беларускіх землях у VIII–IX стст. (*неабходна вылучыць некалькі верных варыянтаў*): | 1) бужане;<br>2) дрыгавічы;<br>3) крывічы;<br>4) радзімічы;<br>5) улічы;<br>6) ціверцы. |
| А 7 | Дата каранацыі Міндоўга | 1) 1251 г.; |

| | | |
|---|---|---|
| | прыпадае на: | 2) 1253 г.;<br>3) 1263 г.;<br>4) 1284 г.. |
| A 8 | Уладар ВКЛ, пры якім тэрыторыя дзяржавы дасягнула найбольшых памераў і магутнасці, – гэта: | 1) Альгерд;<br>2) Вітаўт;<br>3) Гедзімін;<br>4) Ягайла. |
| A 9 | Фактар, які значна паўплываў на ўтварэнне саюза ВКЛ з Польшчай у складзе Рэчы Паспалітай – гэта: | 1) ваенныя паразы ў Лівонскай вайне;<br>2) знешні націск крыжакоў;<br>3) шматлікія набегі татар;<br>4) унутрыдынастычны крызіс. |
| A 10 | Галоўныя знешнія пагрозы, уплыў якіх з'яўляўся істотным уплывовым фактарам дзяржаваўтваральнага працэсу ў Верхнім Панямонні (*неабходна вылучыць некалькі верных варыянтаў*): | 1) крыжакі;<br>2) манголы;<br>3) Вялікае княства Маскоўскае;<br>4) польскае каралеўства;<br>5) шведскае каралеўства. |
| A 11 | Уладар трона Расійскай імперыі, у час праўлення якога беларускія землі былі інкарпарыраваны ў склад гэтай магутнай дзяржавы, – гэта: | 1) Аляксандр I;<br>2) Кацярына II;<br>3) Павел I;<br>4) Петр I. |
| A 12 | Вынікамі далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі сталі: | 1) беларусізацыя і акаталічванне;<br>2) дэпаланізацыя і русіфікацыя;<br>3) насаджэнне ўніяцтва і вестэрнізацыя;<br>4) паланізацыя і акаталічванне. |
| A 13 | Моцным фактарам, які паўплываў на фарміраванне «краевага» патрыятызма ў другой палове XIX ст. на беларускіх землях, стала ажыццяўленне працэсаў: | 1) буржуазных рэформ;<br>2) палітыкі паланізацыі і акаталічвання;<br>3) палітыкі русіфікацыі і абмежаванняў у дачыненні да католікаў і яўрэяў;<br>4) развіцця нацыянальнага руху і ўзнікнення палітычных партый. |
| A 14 | Падзеі ў гісторыі Беларусі XIX ст., якія з'яўляюцца доказамі імкнення да вырашэння пытання аднаўлення дзяржаўнасці, – | 1) паўстанне 1830–1831 гг.;<br>2) паўстанне 1863–1864 гг.;<br>3) паўстанне пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі;<br>4) распрацоўка «Плана |

| | | |
|---|---|---|
| | гэта (*неабходна вылучыць некалькі верных варыянтаў*): | Агінскага»;<br>5) распрацоўка «Плана М. Лорыс-Мелікава»;<br>6) распрацоўка «Плана Агінскага»;<br>6) рэформы П. Кісялева;<br>7) рэформы П. Сталыпіна. |
| А 15 | Гістарычныя падзеі, якія моцна паўплывала на працэс развіцця нацыянальнага руху на тэрыторыі Беларусі ў перыяд з пачатку XX ст. па, – гэта (*неабходна вылучыць некалькі верных варыянтаў*): | 1) абвяшчэнне БНР;<br>2) абвяшчэнне ССРБ;<br>3) Першая руская рэвалюцыя;<br>4) Першая сусветная вайна;<br>5) узбуйненні тэрыторыі БССР у міжваенны перыяд. |
| А 16 | Крытэрый, які аб'ядноўвае вызначаныя даты: 1919 г., 1927 г., 1937 г., – гэта: | 1) правядзенне на тэрыторыі Беларусі рэферэндумаў;<br>2) прыняцце канстытуцый, якія замацоўвалі прынцыпы беларускай дзяржаўнасці;<br>3) прыняцце атрыбутаў беларускай дзяржаўнісці: Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага Гімна;<br>4) узбуйненні тэрыторыі БССР у міжваенны перыяд. |
| А 17 | Утварэнне СССР прыпадае на дату, – гэта: | 1) 9 сакавіка 1918 г.;<br>2) 1 студзеня 1919 г.;<br>3) 30 снежня 1922 г.;<br>4) 30 кастрычніка 1939 г.. |
| А 18 | У гісторыі беларускай дзяржаўнасці ў перыяд 28–30 кастрычніка 1939 г. адбылося: | 1) абвяшчэнне Устаўных грамат БНР;<br>2) падпісанне Дэкларацыі і Дагавора аб стварэнні СССР;<br>3) прыняцце Дэкларацыі аб усталяванні савецкай улады ў Заходняй Беларусі і рэзалюцыі «Аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР»;<br>4) прыняцце Канстытуцыі ССРБ і абвяшчэнне ЛітБелССР. |
| А 19 | Дата, на якую прывадае пачатак Другой сусветнай вайны, – гэта: | 1) 1 жніўня 1939 г.;<br>2) 1 верасня 1939 г.;<br>3) 22 чэрвеня 1941 г.;<br>4) 22 ліпеня 1941 г.. |
| А 20 | Кіраўніком БШПД у перыяд | 1) Ц. Бумажкоў; |

| | | |
|---|---|---|
| | Вялікай Айчыннай вайны з’яўляўся: | 2) П. Калінін;<br>3) В. Корж;<br>4) П. Панамарэнка. |
| А 21 | Назва ўсходніх рабочых, вывезеных у гады Другой сусветнай вайны германскімі захопнікамі з акупаваных тэрыторый на прымусовыя работы ў Германію і еўрапейскія краіны, якія знаходзіліся ў складзе германскага блока: | 1) калабаранты;<br>2) крэсавякі;<br>3) остарбайтэры;<br>4) рэпатрыянты. |
| А 22 | У часы акупацыі на тэрыторыі Беларусі буйныя лагеры смерці па колькасці знішчаных ахвяр, – гэта (*неабходна вылучыць некалькі верных варыянтаў*): | 1) Азарычы;<br>2) Асвенцым (Аушвіц);<br>3) Майданак;<br>4) Трасцянец;<br>5) Трэблінка. |
| А 23 | Дата падпісання Статута ААН кіраўніком дэлегацыі БССР у ліку іншых дэлегацый краін – заснавальніц гэтай міжнероднай арганізацыі прыпадае на: | 1) 19 лютага 1943 г.;<br>2) 18 сакавіка 1945 г.;<br>3) 26 чэрвеня 1945 г.;<br>4) 31 жніўня 1945 г.. |
| А 24 | Працэс вяртання на радзіму ваеннапалонных, перамешчаных асоб, бежанцаў, эмігрантаў з аднаўленнем у правах грамадзянства – гэта: | 1) калабарацыя;<br>2) рэабілітацыя;<br>3) рэпатрыяцыя;<br>4) рэстытуцыя. |
| А 25 | Дзяржаўны гімн БССР «Мы, беларусы…» быў прыняты ў: | 1) 1945 г.;<br>2) 1951 г.;<br>3) 1955 г.;<br>4) 1961 г.. |
| А 26 | Беларускі мастак – аўтар графічнага ўзору Дзяржаўнага сцяга БССР у 1951 г. – гэта: | 1) М. Гусеў;<br>2) М. Клімковіч;<br>3) У. Крукоўскі;<br>4) Н. Сакалоўскі. |
| А 27 | Якасны паказчык накіраванасці знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь, якая арыентавана ў стасунках дзяржавы з рознымі рэгіенамі, краінамі | 1) полікультурнасць;<br>2) поліканфесійнасць;<br>3) сацыяльная арыентаванасць;<br>4) шматвектарнасць. |

| | | |
|---|---|---|
| | свету і міжнароднымі арганізацыямі, – гэта: | |
| А 28 | Дата падпісання Белавежскіх пагадненняў кіраўнікамі Беларусі, Украіны і Расіі прыпадае на: | 1) 27 ліпеня 1990 г.;<br>2) 19 верасня 1991 г.;<br>3) 8 снежня 1991 г.;<br>4) 15 сакавіка 1994 г.. |
| А 29 | Крытэрый, па якім аб'яднаны даты, на якія прыпадаюць важныя падзеі сацыяльна-палітычнага жыцця Рэспублікі Беларусь: 1994 г., 2001 г., 2006 г., 2010 г., 2015 г., 2020 г., – гэта: | 1) выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;<br>2) правядзенне рэферэндумаў па найважнейшых пытаннях развіцця краіны;<br>3) правядзенне Усенародных сходаў;<br>4) прыняцце рэдакцый Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. |
| А 30 | Даты, якія з'яўляюцца этапнымі ў развіцці інтэграцыі паміж Беларуссю і Расіяй, – гэта (*неабходна вылучыць некалькі верных варыянтаў*):: | 1) 15 сакавіка 1994 г.<br>2) 2 красавіка 1996 г.;<br>3) 24 лістапада 1996 г.;<br>4) 2 красавіка 1997 г.;<br>5) 8 снежня 1999 г;<br>6) 17 кастрычніка 2004 г.. |
| В 1 | Вызначце дакладна ў гістарычнай паслядоўнасці (*напрыклад, АБГВ*):<br>А) бітва на р. Нямізе;<br>Б) заснаванне Полацкага і Тураўскага епіскапстваў;<br>В) легендарнае запрашэнне варагаў на Русь;<br>Г) пачатак барацьбы Полацкага княства і яго саюзнікаў з крыжакамі. | |
| В 2 | Вызначце дакладна ў гістарычнай паслядоўнасці (*напрыклад, АБГВ*):<br>А) бітва на р. Ворскле;<br>Б) бітва на р. Сінія Воды;<br>В) бітва на р. Стрэве;<br>Г) бітва пад Грунвальдам. | |
| В 3 | Вызначце дакладна ў гістарычнай паслядоўнасці (*напрыклад, АБГВ*):<br>А) дзейнасць групы «Гоман»;<br>Б) дзейнасць Таварыстваў | |

| | | |
|---|---|---|
| | філаматаў і філарэтаў;<br>В) заснаванне «Дэмакратычнага таварыства»;<br>Г) стварэнне першых палітычных партый (ПСР, БСГ, Бунд). | |
| В 4 | Вызначце дакладна ў гістарычнай паслядоўнасці (*напрыклад, АБГВ*):<br>А) абвяшчэнне Устаўных грамат БНР;<br>Б) абвяшчэнне Маніфеста аб стварэнні ССРБ;<br>В) існаванне ЛітБелССР;<br>Г) падпісанне Рыжскага мірнага дагавора паміж Савецкай Расіяй і Польшчай. | |
| В 5 | Вызначце дакладна ў гістарычнай паслядоўнасці (*напрыклад, АБГВ*):<br>А) напад Германіі на СССР;<br>Б) пачатак Другой сусветнай вайны;<br>В) пачатак акупацыі тэрыторыі Беларусі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны;<br>Г) стварэнне партызанскіх зон на акупіраванай тэрыторыі Беларусі. | |
| В 6 | Вызначце дакладна ў гістарычнай паслядоўнасці (*напрыклад, АБГВ*):<br>А) абвяшчэнне палітыкі перабудовы;<br>Б) лібералізацыя сацыяльна-палітычнага жыцця ў рэспубліцы;<br>В) прыняцце Канстытуцыі БССР («Канстытуцыя развітога сацыялізма»);<br>Г) рэалізацыя пасляваеннага плана аднаўлення народнай гаспадаркі БССР. | |
| В 7 | Вызначце дакладна ў | |

| | | |
|---|---|---|
| | гістарычнай паслядоўнасці (*напрыклад, БГАВ*):<br>А) аварыя на ЧаЭС;<br>Б) падпісанне дамоўленасцей аб інтэграцыі Беларусі і Расіі;<br>В) путч Дзяржаўнага камітэту па надзвычайнаму становішчу;<br>Г) ратыфікацыя Белавежскіх пагадненняў Вярхоўным Саветам Беларусі. | |
| В 8 | Правільна суаднясіце элементы двух мностваў (*напрыклад, 1В2Г3Б4Д*):<br>1) Брачыслаў Ізяславіч, Усяслаў Брачыславіч;<br>2) Рагнеда, Ізяслаў;<br>3) Святаполк Уладзіміравіч, Юрый Яраславіч;<br>4) Уладзімір Полацкі, Вячка.<br><br>А) барацьба беларускіх княстваў з татарамі;<br>Б) барацьба Полацка і саюзнікаў з крыжакамі;<br>В) вядзенне Полацкам незалежнай ад Кіева палітыкі ў XI-XII стст.;<br>Г) вядзенне Туравам незалежнай ад Кіева палітыкі;<br>Д) гістарычна першыя прыклады хрысціянізацыі. | |
| В 9 | Правільна суаднясіце элементы двух мностваў (*напрыклад, 1В2Г3Б4Д*):<br>1) барацьба за першанства ў збіранні ўсходнеславянскіх зямель;<br>2) вестэрнізацыя сацыяльна-палітычных інстытутаў ВК;<br>3) дэмаграфічны і эканамічны крызіс;<br>4) узнікненне федэратыўнай дзяржавы. | |

| | | |
|---|---|---|
| | А) войны з Маскоўскай дзяржавай;<br>Б) вынікі Паўночнай вайны;<br>В) падзелы Рэчы Паспалітай;<br>Г) прыняцце Крэўскай уніі;<br>Д) прыняцце Люблінскай уніі. | |
| В 10 | Правільна суаднясіце элементы двух мностваў (*напрыклад, 1В2Г3Б4Д*):<br>1) «Гоман»;<br>2) «Загляне сонца і ў наша аконца»;<br>3) «Мужыцкая праўда»;<br>4) «Наша Ніва».<br><br>А) К. Каліноўскі, Ф. Ражанскі;<br>Б) В. Ластоўскі, А. Уласаў;<br>В) А. Марчанка, Х. Ратнер;<br>Г) Б. Тарашкевіч, П. Мятла;<br>Д) Б. Эпімах-Шыпіла, В. Іваноўскі. | |
| В 11 | Правільна суаднясіце элементы двух мностваў (*напрыклад, 1В2Г3Б4Д*):<br>1) 3 сакавіка 1918 г.;<br>2) 1 студзеня 1919 г.;<br>3) 3 лютага 1919 г.;<br>4) 18 сакавіка 1921 г..<br><br>А) абвяшчэнне Дэкларацыі аб стварэнні ЛітБелССР;<br>Б) абвяшчэнне Маніфеста аб стварэнні ССРБ;<br>В) заключэнне Дагавора аб дружбе і граніцах паміж СССР і Германіяй;<br>Г) заключэнне Брэст-Літоўскага мірнага дагавора Савецкай Расіі з Германіяй;<br>Д) заключэнне Рыжскага мірнага дагавора паміж Савецкай Расіяй і Польшчай. | |

| | | |
|---|---|---|
| В 12 | Правільна суаднясіце элементы двух множстваў (*напрыклад, 1В2Г3Б4Д*):<br>1) вызваленне ад акупацыі першага ў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны населенага пункта Беларусі;<br>2) дзейнасць Народнага сходу Заходняй Беларусі;<br>3) першы ў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны прыклад выкарыстання рэактыўных мінаметаў;<br>4) першы ў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны прыклад выкарыстання «шкляной артылерыі».<br><br>А) Беласток;<br>Б) Камарын;<br>В) Магілеў<br>Г) Мінск;<br>Д) Орша. | |
| В 13 | Правільна суаднясіце элементы двух множстваў (*напрыклад, 1В2Г3Б4Д*):<br>1) аварыя на ЧаЭС;<br>2) падпісанне Белавежскіх пагадненняў;<br>3) падпісанне Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі;<br>4) прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР.<br><br>А) 26 красакавіка 1986 г.;<br>Б) 27 ліпеня 1990 г.<br>В) 8 снежня 1991 г.;<br>Г) 15 сакавіка 1994 г.<br>Д) 8 снежня 1999 г.. | |
| В 14 | Правільна суаднясіце элементы двух множстваў (*напрыклад, 1В2Г3Б4Д*):<br>1) 1994 г., 2001 г., 2006 г., | |

| | | |
|---|---|---|
| | 2010 г., 2015 г., 2020 г.;<br>2) 1994 г., 1996 г., 2004 г., 2021 г.;<br>3) 1995 г., 1996 г., 2004 г., 2022 г.;<br>4) 1996 г., 2001 г., 2006 г., 2010 г., 2016 г..<br><br>А) правядзенне выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;<br>Б) правядзенне рэферэндумаў у Рэспубліцы Беларусь;<br>В) правядзенне Усенародных сходаў у Рэспубліцы Беларусь;<br>Г) прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і яе новых рэдакцый;<br>Д) этапы развіцця інтэграцыі паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй. | |
| В 15 | ….  ….  – гэта гістарычны працэс, прыкметамі якога ў феадальных дзяржавах з’яўлялась іх драбленне і ўсобіцы паміж князямі – кіраўнікамі асобных зямель і валасцей. | |
| В 16 | Старажытны беларускі горад, у якім адбылося паседжанне другога «нямога» сейма Рэчы Паспалітай (*вызначце лічбу на карце і назву, напрыклад: 2МАГІЛЕЎ*):<br><br> | |

| | | |
|---|---|---|
| | | |
| В 17 | У часы імператара Мікалая I 19 кастрычніка 1831 г. быў прыняты закон «Аб …. …. ў заходніх губернях і аб уладкаванні гэтага роду людзей». | |
| В 18 | …. – гэта дата прыняцця Канстытуцыі БССР, у якой упершыню быў замацаваны статус Мінска ў якасці сталіцы рэспублікі. | |
| В 19 | «….» – гэта назва стратэгічнай наступальнай аперацыі Чырвонай Арміі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны, у выніку якой тэрыторыя БССР была поўнасцю вызвалена ад германскіх захопнікаў. | |
| В 20 | Беларускі горад, які на момант заканчэння Вялікай Айчыннай вайны ў пачатку аднаўленчага перыяду разглядаўся ў якасці варыянта пераносу сталіцы БССР з разбуранага ў часы акупацыі Мінска (*вызначце лічбу на карце і назву, напрыклад: 2БРЭСТ*):<br><br> | |
| В 21 | Дзяржаўны …. – гэта паняцце, якое тлумачыцца ў якасці незалежнасці і самастойнасці дзяржавы ва ўнутранай і знешняй палітыцы, якая не дапускае | |

| | | |
|---|---|---|
| | ўмяшання звонку. | |

## РАЗДЗЕЛ 2
## АСНОВЫ ДЗЯРЖАЎНАГА ЛАДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
## ВАРЫЯНТ 1

| № | Фармулеўкі заданняў | Варыянт (варыянты) адказу (адказаў) |
|---|---|---|
| А 1 | Форма арганізацыі грамадства, у межах якой носьбіты ўлады валодаюць пэўнымі сродкамі і метадамі яе прымянення ўнутры грамадства, – гэта: | 1) горад;<br>2) грамадства;<br>3) дзяржава;<br>4) улада. |
| А 2 | Дата прыняцця першай у гісторыі беларускай дзяржаўнасці ў XX с. канстытуцыі прыпадае на: | 1) 1918 г.;<br>2) 1919 г.;<br>3) 1922 г.;<br>4) 1927 г.. |
| А 3 | Згодна Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь адзінай крыніцай улады ў дзяржаве з'яўляецца: | 1) армія;<br>2) народ;<br>3) прэзідэнт;<br>4) урад. |
| А 4 | Упершыню Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь была прынята ў: | 1) 1991 г.;<br>2) 1992 г.;<br>3) 1994 г.;<br>4) 1996 г.. |
| А 5 | Згодна Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь адзінай формай змянення зместа | 1) галасаванне ў парламенце;<br>2) прыняцце закона;<br>3) прыняцце пастановы |

| | | |
|---|---|---|
| | галоўнага закона краіны ў яго вырашальных артыкулах з'яўляецца: | Канстытуцыйнага Суда;<br>4) рэферэндум. |
| А 6 | Глава дзяржавы ў Полацкім княстве – гэта: | 1) гаспадар;<br>2) кароль (конунг);<br>3) князь;<br>4) пасаднік. |
| А 7 | Упершыню згодна з асноўным законам Рэспублікі Беларусь абранне Прэзідэнта краіны адбылося ў: | 1) 1991 г.;<br>2) 1992 г.;<br>3) 1994 г.;<br>4) 1996 г.. |
| А 8 | У гісторыі беларускай дзяржаўнасці С. Шушкевіч, В. Кузняцоў, М. Грыб, С. Шарэцкі – гэта: | 1) кіраўнікі Савета міністраў БССР;<br>2) старшініі Вярхоўнага Савета БССР;<br>3) старшініі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь;<br>4) старшыні Савета Рэспублікі. |
| А 9 | Тэрмін, які ў сваім перакладзе з лацінскай мовы азначае «той, хто сядзіць наперадзе», – гэта: | 1) кароль;<br>2) прэзідэнт;<br>3) старшыня;<br>4) уладар. |
| А 10 | Згодна з рэдакцыяй Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь ад 2022 г. калькасць тэрмінаў, якую здольна займаць на ўсю працягласць абрання адна асоба на пасадзе прэзідэнта краіны: | 1) без абмежаванняў;<br>2) не больш аднаго тэрміна;<br>3) не больш двух тэрмінаў;<br>4) не больш трох тэрминаў. |
| А 11 | Галіна ўлады, якую ва ўмовах прававой дзяржавы прадстаўляе урад Рэспублікі Беларусь, – гэта: | 1) выбарчая;<br>2) выканаўчая;<br>3) заканадаўчая;<br>4) судзебная. |
| А 12 | Этап развіцця гісторыі беларускай дзяржаўнасці, на якім упершыню ў якасці выканаўчых органаў улады узніклі міністэрствы, – гэта: | 1) савецкі;<br>2) этап знаходжання беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі;<br>3) этап абвяшчэння і існавання незалежнай і суверэннай Рэспублікі Беларусь;<br>4) этап утварэння і існавання ВКЛ. |
| А 13 | Старшыня СНК БССР у 1927–1937 гг. – гэта: | 1) М. Галадзед;<br>2) М. Гікала;<br>3) Зм. Жылуновіч; |

| | | |
|---|---|---|
| | | 4) А. Чарвякоў. |
| А 14 | Пасада караўніка вышэйшага органа выканаўчай улады згодна Канстытуцыі Рэспубліцы Беларусь, – гэта: | 1) Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;<br>2) Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь;<br>3) Прэм’ер-міністр;<br>4) Старшыня Савета Рэспублікі. |
| А 15 | У гісторыі беларускай дзяржаўнасці М. Чыгір, С. Лінг, У. Ярмошын – гэта: | 1) кіраўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;<br>2) кіраўнікі Нацыянальнага Банка Рэспублікі Беларусь;<br>3) Прэм’ер-міністры ўрада;<br>3) Старшыні Савета Рэспублікі. |
| А 16 | Галіны ўлады, якія згодна Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь прадстаўляе Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь, – гэта (*неабходна вылучыць некалькі верных варыянтаў*): | 1) выбарчая;<br>2) выканаўчая;<br>3) заканадаўчая;<br>4) прадстаўнічая;<br>5) судзебная. |
| А 17 | Згодна Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у рэдакцыі 2022 г. ніжняя палата Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, – гэта: | 1) Палата выбаршчыкаў;<br>2) Палата прадстаўнікоў;<br>3) Савет Міністраў;<br>4) Савет Рэспублікі. |
| А 18 | Дата, на якую прыпадае фарміраванне Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, – гэта: | 1) 1991 г.;<br>2) 1994 г.;<br>3) 1996 г.;<br>4) 2001 г.. |
| А 19 | Згодна з рэдакцыяй Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь ад 2022 г. мінімальны ўзрост кандыдата на абранне на пасаду верхняй палаты Нацыянальнага сходу складае не менш за: | 1) 21 год;<br>2) 30 гадоў;<br>3) 35 гадоў;<br>4) 40 гадоў. |
| А 20 | Згодна з рэдакцыяй Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь ад 2022 г. тэрмін паўнамоцтваў Нацыянальнага сходу складае: | 1) 3 гады;<br>2) 4 гады;<br>3) 5 гадоў;<br>4) 6 гадоў. |
| А 21 | У гісторыі беларускай дзяржаўнасці вышэйшы судовы орган ВКЛ – гэта: | 1) копны суд;<br>2) магістрацкі суд;<br>3) суд Гаспадарскі;<br>4) суд послухаў. |

| | | |
|---|---|---|
| А 22 | У гісторыі беларускай дзяржаўнасці дата заснавання Канстытуцыйнага суда Рэспублікі Беларусь прыпадае на: | 1) 1991 г.;<br>2) 1994 г.;<br>3) 1996 г.;<br>4) 2004 г.. |
| А 23 | Згодна з рэдакцыяй Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь ад 2022 г. тэрмін, на які абіраюцца суддзі Канстытуцыйнага Суда: | 1) 4 гады;<br>2) 5 гадоў;<br>3) 11 гадоў;<br>4) пажыццева. |
| А 24 | Згодна з рэдакцыяй Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь ад 2022 г. раздзелы, якія магчыма змяняць праз механізм рэферэндума (*неабходна вылучыць некалькі верных варыянтаў*): | 1) Раздзелы I, II;<br>2) Раздзел III;<br>3) Раздзел IV;<br>4) Раздзелы V, VI;<br>5) Раздзел VII;<br>6) Раздзел VIII. |
| А 25 | Сучасны (па стане на 2022 г.) адміністратыўна-тэрытарыяльны падзел Рэспублікі Беларусь быў усталяваны ў перыяд: | 1) 1940-х гг.;<br>2) 1950-х гг.;<br>3) 1960-х гг.;<br>4) 1970-х гг.. |
| А 26 | Згодна з рэдакцыяй Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь ад 2022 г. тэрмін паўнамоцтваў абраных мясцовых Саветаў дэпутатаў складае: | 1) 3 гады;<br>2) 5 гадоў;<br>3) 6 гадоў;<br>4) 10 гадоў. |
| А 27 | Узроўневае адміністрацыйнае дзяленне ў Рэспубліцы Беларусь (па стане на 2022 г.) з'яўляецца: | 1) аднакампанентным;<br>2) двухузроўневым;<br>3) трохузроўневым;<br>4) пяціўзроўневым. |
| А 28 | Паняцце, якое вызначае статус чалавека без грамадзянства, – гэта: | 1) апазицыянер;<br>2) апатрыд;<br>3) біпатрыд;<br>4) радыкал. |
| А 29 | У гісторыі беларускай дзяржаўнасці першая легальная беларуская палітычная партыя – гэта: | 1) Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў (БПСР);<br>2) Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ);<br>3) Беларуская сялянска-работніцкая грамада (БКРГ);<br>4) Камуністычная партыя Заходняй Беларусі (КПЗБ). |

| | | |
|---|---|---|
| А 30 | Згодна беларускаму заканадаўству членства ў палітычнай партыі недапушчальна сярод іншых для (*неабходна вылучыць некалькі верных варыянтаў*): | 1) апатрыдаў;<br>2) былых членаў Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў;<br>3) ваеннаслужачых;<br>4) дзеяздольных грамадзян Беларусі, якія дасягнулі 18-гадовага ўзросту;<br>5) пракурорскіх работнікаў;<br>6) кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь;<br>7) суддзяў. |
| В 1 | Вызначце дакладна ў гістарычнай паслядоўнасці (*напрыклад, АБГВ*):<br>А) Канстытуцыя Рэчы Паспалітай;<br>Б) «Руская праўда»;<br>В) Статуты ВКЛ;<br>Г) Судзебнік Казіміра Ягелончыка. | |
| В 2 | Вызначце дакладна ў гістарычнай паслядоўнасці (*напрыклад, АБГВ*):<br>А) Дэкларацыя аб аб'яднанні ЛітБелССР;<br>Б) Канстытуцыя БССР;<br>В) Маніфест аб стварэнні ССРБ;<br>Г) Устаўныя граматы БНР. | |
| В 3 | Вызначце дакладна ў гістарычнай паслядоўнасці (*напрыклад, БАГВ*):<br>А) Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР;<br>Б) Закон «Аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці БССР»;<br>В) Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь;<br>Г) пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь аб скасаванні Дагавора аб | |

| | | |
|---|---|---|
| | утварэнні СССР. | |
| В 4 | Вызначце дакладна ў гістарычнай паслядоўнасці (*напрыклад, АБГВ*):<br>А) абвяшчэнне беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове;<br>Б) абвяшчэнне пабудовы «дзяржавы развітога сацыялізма»;<br>В) пабудова дзяржавы дыктатуры пралетарыяту;<br>Г) усталяванне прэзідэнцкай рэспублікі.А | |
| В 5 | Вызначце дакладна ў гістарычнай паслядоўнасці кіраўнікоў беларускага ўрада (*напрыклад, АБГВ*):<br>А) Я. Адамовіч;<br>Б) А. Чарвякоў;<br>В) М. Галадзед;<br>Г) П. Панамарэнка. | |
| В 6 | Вызначце дакладна ў гістарычнай паслядоўнасці (*напрыклад, БАГВ*):<br>А) веча;<br>Б) Вярхоўны Савет БССР;<br>В) сейм;<br>Г) Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь і Усебеларускі народны сход. | |
| В 7 | Вызначце дакладна ў гістарычнай паслядоўнасці (*напрыклад, БГАВ*):<br>А) Вярхоўны Савет БССР;<br>Б) Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь;<br>В) Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь;<br>Г) Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР. | |
| В 8 | Правільна суаднясіце элементы двух мностваў (*напрыклад, 1В2Г3Б4Д*):<br>1) Канстытуцыя БССР | |

| | | |
|---|---|---|
| | («Канстытуцыя перамогшага сацыялізма»);<br>2) Канстытуцыя БССР («Канстытуцыя развітога сацыялізма»);<br>3) Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь;<br>4) Канстытуцыя ССРБ.<br><br>А) 1919 г.;<br>Б) 1927 г.;<br>В) 1937 г.;<br>Г) 1978 г.;<br>Д) 1994 г.. | |
| В 9 | Правільна суаднясіце элементы двух мностваў (*напрыклад, 1В2Г3Б4Д*):<br>1) дзейнасць заканадаўства БССР у міжваенны перыяд;<br>2) дзейнасць заканадаўства БССР у ваенны і пасляваенны перыяд;<br>3) дзейнасці на тэрыторыі Беларусі кароткачасовых дзяржаўных і адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак;<br>4) распрацоўка і дзейнасць заканадаўства Рэспублікі Беларусь.<br><br>А) 1917–1920 гг.<br>Б) 1921–1939 гг.;<br>В) 1939–1990 г.;<br>Г) 1990–1994 гг.;<br>Д) з жніўня–верасня 1991 г. па сяняшні час. | |
| В 10 | Правільна суаднясіце элементы двух мностваў (*напрыклад, 1В2Г3Б4Д*):<br>1) абвяшчэнне дзяржаўнасці на нацыянальна-дэмакратычнай аснове;<br>2) абвяшчэнне беларускай дзяржаўнасці на савецкай | |

| | | |
|---|---|---|
